**УДК 882.6-31:398**

# МАСТАЦКІ ЭТНАГРАФІЗМ У ТВОРАХ БЕЛАРУСКГХ ПРАЗАІКАЎ XX СТАГОДДЗЯ ПРА ВЁСКУ: ТЫПЫ, ФУНКЦЫІ, ДЫНАМІКА

***канд. філал. навук, дац. В.Ю. БАРОЎКА***
***(Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М. Машэрава)***

*Вывучэнне нацыянальнай спецыфікі айчыннага прыгожага пісьменства - адна з актуальных задач сучаснага літаратуразнаўства. Артыкул прысвечаны аналізу тыпаў, функций і дынамікі мастацкага этнаграфізму ў творах беларускіх празаікаў XX стагоддзя пра вёску.*

Так званая вясковая тэма ў беларускай прозе XX стагоддзя даволі доўга належала да дамінантных. Справа ў тым, што сельская гаспадарка і сялянскі быт у грамадскім укладзе беларусаў заўсёды займалі значнае месца. Зварот да вясковай тэматыкі адкрываў багатыя магчымасці для даследавання нацыянальнага характару і гістарычнага шляху беларуса, змены пакаленняў, для асэнсавання вечнай праблемы бацькоў і дзяцей. Цікавасць да вясковай тэмы абумоўлена была і яшчэ адным немалаважным фактарам. Беларус у нядаўнім мінулым - гэта, галоўным чынам, земляроб. Літоўскі пісьменнік Юсцінас Марцінкявічус дасціпна зазначыў, што «эпічнае светаадчуванне ў народаў, асноўны касцяк якіх складала сялянства, як бы вырастала з вечнага жадання ўнесці парадак - тэты першаэлемент эпасу - у жыццё, асвяціць яго промнем гістарычнага значэння» [1, с. 60]. Мастацкая структура і вобразная сістэма беларускай прозы складваліся на матэрыяле вясковага жыцця, вёска займала прыярытэтнае становішча як аб’ект мастацкага пазнання, бо змены, што адбываліся ў грамадстве, больш выразна праяўляліся ў вясковай рэчаіснасці, пры адлюстраванні якой пісьменнікі даволі актыўна звярталіся да мастацкага этнаграфізму. Падыход жа аўтараў да этнаграфічнага матэрыялу, функцыі яго ў літаратурных творах не заставаліся статычнымі на працягу мінулага стагоддзя.

Мастацкі этнаграфізм у беларускай прозе пачатку XX стагоддзя быў з’явай эстэтычна і гістарычна апраўданай, бо проза перажывала час свайго інтэнсіўнага станаўлення, а этнаграфічныя апісанні выступал! адным са сродкаў рэалістычнага адлюстравання свету. Увядзенне этнакантэксту жанрава не дэтэрмінавалася, ён мог прысутнічаць і ў замалёўцы, і ў сацыяльна-бытавым апавяданні, і ў аповесці. Мастацкі этнаграфізм у прозе пачатку мінулага стагоддзя, у першую чаргу, выступаў у рэпрэзентатыўна-інфарматыўнай ролі, ён яшчэ не заўсёды арганічна ўпісваўся ў мастацкі твор, не заўсёды выконваў функцыю эстэтычную, напрыклад, у творах прадстаўнікоў так званай масавай прозы (Я. Шпэт, К. Аляхновіч-Чэркас, А. Новіч і інш.) быў сродкам непасрэднай фіксацыі жыццёвай плыні. Этнаграфічнае ў прыгожым пісьменстве часта звязваюць з паэтыкай рамантызму, аднак у беларускай прозе пачатку XX стагоддзя элементы рамантызацыі назіраліся рэдка і хіба што толькі ў паасобных творах К. Каганца, напрыклад, у «Страшным заклінанні», каб стварыць атмасферу таямнічасці.

Вясковы быт з яго драматызмам і камізмам жыццёвых калізій знайшоў грунтоўнае выяўленне ў прозе Якуба Коласа. Самы першы па часе напісання празаічны твор пісьменніка «Наша сяло, людзі і што робіцца ў сяле» адны даследчыкі называюць «этнаграфічнымі нататкамі» (Э. Сабаленка), другія - «этнаграфічным нарысам» (М. Тычына), бо аўтар асноўную ўвагу там надаў паказу быту і нораваў вяскоўцаў. Колас - чалавеказнаўца, таму ў яго прозе этнаграфічны кантэкст падначальваўся даследаванню чалавечага характару, нават тады, калі пісьменнік даволі падрабязна паказваў пэўныя звычаі (апавяданне «Калядны вечар») ці абставіны і ўклад жыцця насельнікаў Палесся і цэнтральнай Беларусі (трылогія «На ростанях»), Колас стаў заснавальнікам традыцыйнай для беларускай прозы лініі даследавання быцця беларуса праз быт. Этнаграфічна-бытавыя апісанні падаваліся пісьменнікам у аб’ектывізаванай форме праз аўтарскія апісанні. Дзейсным сродкам эстэтычнага адмаўлення шэрай і беднай вясковай паўсядзённасці стала адлюстраванне сялянскага быту ў ранняй прозе Змітрака Бядулі. У Бядулевых «Абразках» вясковы побыт прадстаўлены героем-апавядальнікам у рамантычна завостраным выглядзе. Быт рэзка проціпастаўляўся парыванням героя-летуценніка, падкрэсліваў невыноснасць існавання асобы ў межах нуднай паўсядзённасці. Плённы мастацкі ракурс у выкарыстанні этнаграфічнага матэрыялу адпачаткова выбраў М. Гарэцкі, стылю якога ўласціва заглыбленасць «у пабытавыя асновы народнага жыцця» (Д. Бугаёў), пазнанне «нацыянальнай сутнасці быцця» (В. Каваленка). У прозе Максіма Гарэцкага мастацкі этнаграфізм выступаў дзейсным сродкам адмаўлення кандовай патрыярхальшчыны, з аднаго боку, і сродкам сімвалізацыі жыццёвых з’яў і тыпізацыі характараў і абставінаў, з другога боку. Вёска ў ранняй прозе Гарэцкага («У лазні», «Рунь», «Роднае карэнне») выступала як супярэчлівы па сваёй сутнасці грунт нацыянальнай рэчаіснасці. Этнаграфічны кантэкст у яго творчасці адпачаткова набываў інтэлектуальнае напаўненне, этнаграфічнае не выцясняла псіхалагічнае і філасофскае.

Пісьменнікі 20-х гадоў мінулага стагоддзя звярталі ўвагу на неабходнасць перамен у жыцці, таму паказ вясковай рэчаіснасці з яе патрыярхальным укладам ператвараўся ў сродак адмаўлення старога жыцця і прапаганды новага. Вясковы свет пісьменнікамі таго часу трактаваўся неадназначна. Прасталінейнасцю ў адлюстраванні вясковага быту характарызаваліся паасобныя творы беларускіх празаікаў («У глушы»
3. Бядулі, «Кірмаш» М. Чарота, «Фэст» К. Чорнага, «Рубанаўскі вузел», «Яўленая» П. Галавача і інш.), бо аўтары артыкулявалі неабходнасць перамен, апе наступленне іх падавалася спрошчана, аблегчана. Існаваў і іншы падыход да паказу вёскі і вяскоўцаў. Так, Васіль Каваль шляхам падрабязнага бытапісання імкнуўся занатаваць аб’ектыўны стан сучаснай яму рэчаіснасці. Ян Скрыган наступным чынам ахарактарызаваў накіраванасць прозы В. Кавапя ў 20-я гады: «Першыя кнігі Васіля Каваля - гэта паэмы пра зачараваны край, пра вёску і спрадвечны лад жыцця селяніна. Гора, бяда, нараджэнне і смерць, гіраца і ўслаўленне яе - паказу гэтага ладу жыцця падпарадкавана ўся паэтыка Кавалёвай творчасці» [2, с. 226]. Пісьменнік марыў пра новы дзень, пра адраджэнне, на яго думку, асновы беларускага свету- вёскі, важнымі адзнакамі якой лічыў традыцыяналізм у сэнсе павагі да вопыту мінулых часоў, паэтычнасць многіх звычаяў і абрадаў. На рэчаіснасць Каваль-празаік глядзеў вачамі апавядальніка, асобы ўзростава і духоўна роднаснай аўтару («Як вясну гукалі», «Сяльчане», «Жніво» і інш.). Проза 20-х гадоў В. Каваля была апісальнай, таму мастацкі этнаграфізм даваў уяўленне пра вясковы быт і адначасова запавольваў дзеянне, стымуляваў сюжэтную рыхласць твораў. Добрым знаўцам сялянскага жыцця выявіў сябе Кузьма Чорны. У яго творах даследавалася, як быт фарміруе характар чалавека. Пісьменнік не ідэалізаваў вёску, дзе суіснавалі працавітасць і гультайства, зайздрасць і шчырасць, грамадская інертнасць і прага новага («Маё дзела цялячае», «Максімка», «Быльнікавы межы», «Сястра», «Зямля»), Акцэнт на чаканне і набліжэнне новага ў прозе Кузьмы Чорнага быў больш выразным, чым у прозе В. Каваля. Этнаграфічныя дэталі ў творах К. Чорнага мелі не толькі характар апісальны, але і сюжэтнавызначальны. Так, у апавяданні «Вераснёвыя ночы» бытавыя замалёўкі давалі штуршок дзеянню і руху пачуццяў галоўнай гераіні Агаты. Раман «Зямля» з яго каляндарна-цыклічнай кампазіцыяй, даследаваннем тыпаў вяскоўцаў, узнаўленнем побыту 20-х гадоў - удалая спроба паказаць нацыянальны характар у разнастайнасці яго варыянтаў. Кузьма Чорны прадстаўляў у першым беларускім рамане, па метафарычным азначэнні А. Бабарэкі, філосафам, для якога зямля - гэта родны край і людзі, што яго насяляюць. Лукаш Калюга ў апавяданнях і аповесцях 20-х гадоў («Краўцы і чаляднікі», «Лук’ян - капераціўскі сабака», «Трахім з Пагулянкі», «Баркаўцы - добрая вёска, а баркаўчане - вясёлыя людзі», «Іллюк-даследчык», «Ні госць ні гаспадар», «Нядоля Заблоцкіх») часта ўводзіў апісанні старадаўніх звычаяў, згадваў народныя прыкметы, каб паіранізаваць з патрыярхальнасці старых вяскоўцаў. У апавяданні «Тахвілін швагер», напрыклад, аўтар высмеяў людзей, якія кіруюцца не здаровым сэнсам, а сляпой верай у магічную сілу традыцыі, чужога вопыту. Багаты этнаграфічны матэрыял у аповесці «Ні госць ні гаспадар» дазваляў пісьменніку перадаць асаблівасці гістарычна памежнага часу, сутыкненне маральных імператываў старога і маладога пакаленняў сялян. Іранічнай мініэпапеяй нядзейсненых мар стала аповесць Л. Калюгі «Нядоля Заблоцкіх», дзе вядомы на Беларусі жарт пра Заблоцкага, які спадзяваўся, але не змог зарабіць на мыле, набываў сімвалічнае напаўненне. Часта этнаграфічны матэрыял іранічна падсвечваўся апавядальнікам, кшталту наступнага: «Некалі казалі — гадавыя святы праўдзяць. Які ты ў гэты дзень будзеш, такім застанешся і на ўвесь год: благое што зробіш - благі, а добрае - добры будзеш без канца-краю. І от баркаўчане, каб ні благімі, ні добрымі не быць (бо ёсць прыказка: не будзь салодкі, а то праглынуць, не будзь горкі - а то праплююць) спяць кожнае свята з ранку да вечара цалюткі дзень» [3, с. 266]. Вёска пачатку XX стагоддзя ўзнаўлялася ў аповесцях М. Гарэцкага «Ціхая плынь», «Меланхолія», «У чым яго крыгуда?». Яна выступала мадэллю нацыянальнага свету, што мае вострую патрэбу найперш у эканамічным і сацыяльным удасканаленні. Характэрная адзнака творчай манеры Гарэцкага сутыкненне некалькіх пунктаў погляду на пэўную з’яву, уменне ўбачыць яе вачамі розных людзей, як, напрыклад, апісанне «забранага краю» і хаты Хомкавых бацькоў у «Ціхай плыні». Усевалад Сурганаў заўважыў пра савецкую прозу XX гадоў: «Дэпаэтызацыя» вёскі была свайго роду «дзіцячай хваробай левізны» і ў той ці іншай ступені была ўласціва многім мастакам» [4, с. 129]. Што ж датычыць беларускай прозы, то яе аўтары, сапраўды, у 20-я гады шмат пісалі пра недасканаласць вясковага побыту, але «дэпаэтызацыя» старой вёскі ў творчасці беларускіх пісьменнікаў мела месца перш за ўсё ў 30-я гады мінулага стагоддзя. Неабходным сюжэтным прыёмам у ёй тады стала параўнанне дакалгаснага і так званага сучаснага жыцця вяскоўцаў. Мастацкі этнаграфізм станавіўся вызначальным сродкам асуджэння старога свету, яго функцыя ў творах мела так званы ідэалагічны характар. Бясспрэчна, кожны аўтар увасабляў гэта ў адпаведнасці з яго крэатыўнымі магчымасцямі - ад банальнай агіткі да сур’ёзнага твора. У прозе К. Чорнага таго перыяду мастацкі этнаграфізм нярэдка набываў абагуленасімвалічны характар, як у рамане «Трэцяе пакаленне», дзе апісанне сядзібы Скуратовіча ў пачатку твора выступала схемай сюжэта ўсяго твора. Мастацкі этнаграфізм у «Пустадомках» Л. Калюгі, «Віленскіх камунарах» і «Камароўскай хроніцы» М. Гарэцкага паэгызаваў родны край, станавіўся спецыфічным карэлятам гістарызму, аднак названыя раманы былі надрукаваныя значна пазней пасля іх напісання і не маглі істотна ўплываць на літаратурны працэс свайго часу.

Адметнасцю беларускай прозы перыяду Вялікай Айчыннай вайны стала паэтызацыя мірнага даваеннага жыцця, яго станоўчых народных асноў. Нацыянальны космас беларуса знайшоў таленавітае ўвасабленне, для прыкладу, у незакончанай аповесці Кузьмы Чорнага «Скіп'ёўскі лес», дзе этнаграфічны матэрыял арганічна ўплятаўся ў падзейную канву твора, падкрэсліваў працавітасць і міралюбівы характар, прыродную дабрыню беларусаў. У прозе 20-х - першай паловы 40-х гадоў XX стагоддзя суіснавалі па спосабах іх уключэння ў структуру твораў аб'ектывізаваны і суб'ектывізаваны тыпы мастацкага этнаграфізму, дзе апошні характарызаваў адносіны персанажаў да рэчаіснасці і народнага жыцця.

Беларуская проза першага пасляваеннага дзесяцігоддзя засяродзіла ўвагу на адлюстраванні аднаўляемай пасля разбуральнай вайны гаспадаркі. Аб'ектывізаваны мастацкі этнаграфізм занатоўваў дынаміку жыццёвага працэсу. Па слушнай заўвазе В. Каваленкі, у літаратуры таго часу, як правіла, «спрадвечна-патрыярхальнае і новае ў абліччы роднага краю не сумяшчаюцца, а праціпастаўляюцца» [5, с. 267 - 268]. Этнаграфічны кантэкст падкрэсліваў або кансерватыўнасць персанажа, або яго дзівацтва ці паэтычнасць натуры. Так, адна з тераінь аповесці І. Мележа «Гарачы жнівень» калгасны брыгадзір Насця, чалавек з народнай гушчы, шчодра перасыпае сваю мову прыказкамі і прымаўкамі, а маладыя героі-рамантыкі ў аповесці «Вяснянка» Т. Хадкевіча прадстаюць заўзятымі аматарамі беларускіх народных песень. Празаікі засяроджваліся на зменах у жыцці, на новым змесце старых звычаяў і абрадаў: талака як калектыўная калгасная дапамога ў аповесці Ус. Краўчанкі «Вясна на Палессі», талака і ўлазіны ў аповесці Т. Хадкевіча «Вяснянка», зажынкі і дажынкі як ушанаванне працавітых земляробаў у рамане «Святло над Ліпскам» М. Паслядовіча і інш.

Агульнай тэндэнцыяй развіцця беларускай прозы з сярэдзіны 50-х гадоў XX стагоддзя стала асэнсаванне магчымасцей асобы, народнай этыкі. Вясковая тэма распрацоўвалася айчыннымі празаікамі ў двух гістарычных планах - дыяхронным і сінхронным, мастацкі этнаграфізм як складнік прадметнага свету літаратурнага твора пераважна прысутнічаў у творах пра мінулае. Народны характар ў яго гістарычным развіцці занатаваны ў такіх творах, як «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча, «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» І. Мележа, «Чужая бацькаўшчына», «Год нулявы», «І скажа той, хто народзіцца», «Голас крыві брата твайго» В. Адамчыка і інш. Мастацкі этнаграфізм у названых творах абумоўліваўся аўтарскай задумай усебакова паказаць беларуса на складаных паваротах яго драматычнай гісторыі. Айчынныя празаікі заўсёды былі далёкія ад эстэцкага любавання экзотыкай вясковага жыцця, ад псеўданароднага апявання старадаўніх звычаяў, ад «кандовага сентыментальнага народалюбства» (Ф. Кузняцоў), хаця нашы пісьменнікі заўсёды былі ўважлівымі «да падрабязнасцяў, прывязаныя да этнаграфічна-побытавага, да знаёмых з дзяцінства краявідаў і да ўласнага радаводу» [6, с. 118], але гэты факт абумоўліваўся імкненнем хаця б праз знешнія праявы выявіць нацыянальную «самасць» беларускай рэчаіснасці.

У айчыннай прозе 60-х - 80-х гадоў шырока ўводзіўся фальклорна-этнаграфічны фон гіры паказе параўнальна нядаўнага мінулага вяскоўцаў. Гэта абумоўлівалася характарам канфліктнай сітуацыі - сутыкненнем патрыярхальнага светаразумення старога селяніна з сучаснай цывілізацыяй, якая рашуча наступала на вёску. Адлюстраванне асаблівасцей сялянскага побыту суправаджалася ў творчасці беларускіх пісьменнікаў пастаноўкай значных сацыяльных і маральна-этычных пытанняў у прозе Я. Брыля, І. Пташнікава, М. Стральцова, Я. Сіпакова, А. Кудраўца, В. Казько. У гэты перыяд вострa ставілася пытанне пра разыходжанне ідэала і жыцця, паказвалася іх несупадзенне, а самі творы набывалі крытычнае гучанне. Паказальны ў гэтых адносінах раман В. Казько «Неруш», дзе мастацкі этнаграфізм падкрэсліваў змены ў жыцці палешукоў, падмацоўваў пісьменніцкую думку пра тое, што непрадбачлівае ўмяшанне чалавека ў прыроду перш за ўсё калечыць чалавека. Шматзначны ў творы эпізод, калі на вяселлі Надзі Махахей і Ваські Барздыкі невядомыя ўкралі каравай. Раней ніхто б не асмеліўся на такое злачынства, а зараз многімі гэта ўспрымаецца як жарт, як звычайная справа. Прысутнасць этнаграфічна-бытавых дэталей у беларускай вясковай прозе другой паловы XX стагоддзя - гэта не толькі сродак, неабходны для «ідэнтыфікацыі беларушчыны, беларускасці», як зазначала Л. Корань [6, с. 132 - 133], апе і сродак для выяўлення сацыяльнага і маральнага мікраклімату ў грамадстве.

Доўгі час вёска з яе замкнутасцю, традыцыйнасцю, кансерватызмам захоўвала нацыянальны дух. Бытавы і маральны ўклад вясковага жыцця істотна змяніўся ў другой палове XX стагоддзя, і гэта не маглі не паказаць беларускія празаікі з розных мастацкіх пазіцый і на аснове рознага мастацкага вопыту. Вёска як край незваротнага маленства знайшла адбітак у творах М. Стральцова і В. Адамчыка, асабліва ў іх апавяданнях 60 - 70-х гадоў. Бытавыя з'явы і этнаграфічныя дэталі маглі сімвалізавацца, як у насычаным экзістэнцыйнай праблематыкай апавяданні «Смаленне вепрука» М. Стральцова, ці рамантызавацца і лірызаваць персанажа, як у апавяданнях «Песня», «Жывая вада» В. Адамчыка. Міхась Стральцоў і Вячаслаў Адамчык у пачатку творчага шляху аддавалі перавагу суб'ектывізаванаму тыпу мастацкага этнаграфізму. У іх апавяданнях рэаліі побыту падаваліся праз свядомасць героя, а не праз аўтарскія апісанні, што пашырала за кошт успамінаў і асацыяцый герояў часавыя рамкі твораў. Сум па страчанай гармоніі народнага жыцця, па тым, што нярэдка губляюцца ў мітуслівым часе лепшыя рысы чалавечага характару, выяўляўся ў прозе А. Жука, 1. Пташнікава, Я. Сіпакова, В. Казько, аднак у беларускай

літаратуры не было «настальгічных народалюбцаў» (Ф.Кузняцоў), якія б усур'ёз заклікалі павярнуць час назад. З 60-х гадоў мінулага стагоддзя ў айчынным пісьменстве асаблівую надзённасць набывае пытанне пра перспектывы вяскоўцаў у сувязі з імклівым поступам навукова-тэхнічнай рэвалюцыі і абвешчаным палітычным лозунгам на збліжэнне горада і вёскі. У 1917 годзе О. Шпенглер назваў паступовае знікненне сялянскай цывілізацыі «змярканнем Еўропы». Лёс сялянскай Атлантыды заняў значнае месца ў беларускай прозе другой паловы XX стагоддзя, бо беларусы доўгі час усведамлялі сябе сялянскай нацыяй («усе мы з хат»). Знікненне сялянскай цывілізацыі ўспрымалася балюча, як катастрофа агульна-нацыянальнага маштабу. Трывожны роздум над будучым і паэтызацыя здаровых народных асноў праз настальгічна афарбаваныя дэталі побыту ўласцівыя раманам «Алімпіяда» І. Пташнікава, «Неруш», «Хроніка дзетдомаўскага саду» В. Казько, «Сачыненне на вольную тэму» А. Кудраўца, аповесцям «Бярозавыя венікі», «Дзень Барыса і Глеба» В. Карамазава.

Пераломны час з сярэдзіны 80-х гадоў мінулага стагоддзя выклікаў да жыцця новую хвалю твораў пра вёску і вяскоўцаў, абумовіў свае ідэйна-тэматычныя павароты ў распрацоўцы традыцыйнай для беларускай літаратуры тэмы. У творах аўтараў старэйшага пакалення ўзмацніўся крытычны пафас. Гэта ярка адбілася ў аповесці Віктара Казько «Выратуй і памілуй нас, чорны бусел», дзе этнаграфічна-бытавыя дэталі істотна пашыралі семантычнае поле эпічнасці, а міфалагемы набывалі палітычна рэмінісцэнтны характар. Распаўсюджаным матывам у прозе гэтага часу стала проціпастаўленне дакалгаснай і калгаснай вёскі, сум па адсутнасці селяніна-гаспадара, а не наёмнага работніка (аповесць «Аблава» В. Быкава, апавяданні «Кулак» Я. Сіпакова і «Узвіжанне» У. Бутрамеева і іншыя). Можна правесці своеасаблівую паралель паміж ідэйнай накіраванасцю вясковай прозы 30-х гадоў і прозы сярэдзіны 80-х-першай паловы 90-х гадоў: аўтары актыўна выкарыстоўвалі прыём кантрасту, мастацкі этнаграфізм служыў сродкам ідэалагічнай аргументацыі з тым адрозненнем, што сацыяльна-аксіялагічныя кампаненты мелі дыяметральна процілеглы характар. У сярэдзіне 90-х гадоў мінулага стагоддзя П. Дзюбайла зрабіў вывад пра пэўную вычарпанасць пісьменніцкіх рэсурсаў у распрацоўцы вясковай тэмы: «І ўсё ж «вясковая» проза пакуль што па-ранейшаму абжывае ўжо заваяваныя пазіцыі, слаба рухаецца наперад. Значна шкодзіць ёй празмерная павучальнасць, дыдактызм, пэўная ідэалізацыя вобразаў, а то і звычайная мода на вобразы «мудрых» дзядоў і бабуль» [7, с. 240], аднак пастаўлены вядомым навукоўцам дыягназ да канца не апраўдаў сябе. Вясковае жыццё ў найноўшай беларускай прозе значна радзей, чым раней, становіцца аб'ектам мастацкага даследавання. Да яго ў асноўным звяртаюцца тыя пісьменнікі, якія нарадзіліся ў вёсцы. Быт і норавы сучаснай вёскі знайшлі адбітак у прозе А. Кудраўца, І. Пташнікава, М. Вайцяшонак, В. Гардзея, А. Кажадуба, А. Наварыча, Х. Лялько, А. Федарэнкі і іншых. Новы ракурс у распрацоўцы вясковай тэмы пазначыўся ў прозе А. Наварыча, А. Казлова, Б. Пятровіча, А. Федарэнкі, якія свядома адмовіліся ад народапаклонніцтва пры паказе вяскоўцаў. Перараджэнне сялян, іх звычаяў і характараў у бок прагматызму - адна з тэм творчасці Б. Пятровіча. Так, у апавяданні «Русалка» аўтар проціпастаўляе рамантычна-настальгічнае ўяўленне маладых людзей пра родны кут і рэальнае жыццё, дэміфалагізуе вёску. Героі твора Сашка і Шурка з горада прыязджаюць на пабыўку: «Вёска сёння была не зусім звычайная: святочная. Называлася свята «Русалкаю». Па звычаю было яно сярэднім паміж Тройцаю і Купаллем. Бліжэй да Купалля, вядома. Усе платы, хаты былі абчапляны наламанымі з кустоў і дрэваў галінкамі і зелянелі, быццам ажыло дрэва, парасткі выпусціла. Бабулькі на лавачках сядзелі таксама з букетамі-венікамі галінак у руках і адмахваліся імі ад камароў» [8, с. 56]. Святкаванне «Русалкі» глыбока расчаравала хлопцаў, бо падчас яго выйшлі на паверхню горшыя рысы чалавечай натуры: «Русалка дайшла да краю вёскі. Там ўжо шугала ў неба бела-сіняе вогнішча. На ўзгорку, ля самага жыта. Праходжваўся ў чаканні побач кульгавы дзед Хведар са стрэльбай - каб прагнаць стрэламі Русалку, якая заманьвае гожых хлопцаў у жыта і там замучвае іх у сваіх ласках да смерці. Людзі стоўпіліся ля вогнішча, і тут нехта з п'яных і нецярплівых не вытрымаў і да часу кінуўся да вянка, каб урваць з яго большы і лепшы кавалак. За ім кінуліся іншыя. Закрычалі, запішчэлі дзяўчаты, што трымалі вянок, разбегліся, і праз якую хвілю перабіралі ягоныя рэшткі бабулі, дзялілі між сабою, лічылася, што мець пасмы гэтага Русалчынага вянка ў хаце - значыць мець шчасце і дабро. І ховам хавалі яго за абразом ці ў іншай таемнай мясціне да новае Русалкі...» [8, с. 58 - 59].

Алесь Наварыч умела спалучае «вясковую» тэму з распрацоўкай праблемы чалавек і прырода, падкрэсліваючы недасканаласць чалавечай натуры ў параўнанні з маці-прыродай. Нярэдка вясковы быт, прырода ў яго творах надзяляюцца сімвалічным зместам. Так, у апавяданні «Рабкі» экзатычныя палескія птушкі, якія ажываюць у час навальніцы, выступаюць сімвалам жыццёвага гарэння. Для Анатоля Казлова, аўтара твораў «Адкуль з'яўляюцца яны?», «Зацвітанне дзівасілу», «Мацвеева лазня», «Росніца», «Незламаная свечка» і іншых, вёска- таямнічы куток, што захоўвае універсальны маральна-духоўны вопыт мінулых часоў, ігнараваць які недапушчальна не толькі па прычынах маральных, але і чыста прагматычных, а фальклорна-этнаграфічныя дэталі выкарыстоўваюцца для надання творам парабалічнасці, бо гісторыя прыватнага чалавечага лёсу пад пяром пісьменніка набывае абагульняючыя рысы. Даволі глыбока сучаснае вясковае жыццё раскрываецца ў прозе Андрэя Федарэнкі (апавяданні «Памарак»,

«Забабоны», «Гульба святых», аповесць «Вёска»), Зварот Федарэнкі да асэнсавання вясковай рэчаіснасці і псіхалогіі сучаснага вяскоўца «абумоўлены вопытам вясковага маленства 70-х гадоў, і гэтая асоба, гэты вопыт перш за ўсё стаіць за кожным радком нашага аўтара» [6, с, 220], Для А, Федарэнкі вёска— запусцелы кут, які не мае асаблівых надзей на адраджэнне, гэта нашы карані і наша мінулае, у якое з-за няўмольнай хады часу і бытавой неўладкаванасці сучасны прагматычны па характары чалавек не хоча вяртацца, таму цяперашняя вёска - прытулак для ўжо спрацаваных старых і людзей маладога і сярэдняга веку, але малапатрабавальных у бытавым і інтэлектуальным плане, Штампы ў адпюстраванні беларускай вёскі і ўвогуле рэчаіснасці па-майстэрску дэканструяваліся ў рамане «Рэвізія»,

Вясковая проза, хаця многія літаратуразнаўцы і крытыкі шмат наракалі на пэўную ўмоўнасць такога тэрміна, мае ў айчыннай літаратуры сваю адметнасць, Для беларуса абсалютна незразумелае шпенглераўскае сцвярджэнне пра горад-кармілец і вёску-спажыўца, Для нашага прыгожага пісьменства стаў хрэстаматыйным вобраз вёскі-працаўніцы, калыскі беларускасці, захавальніцы нацыянальнага духу, які часта раскрываўся з дапамогай мастацкага этнаграфізму, У сучаснай прозе этнакантэкст, у першую чаргу, уласцівы тым творам на вясковую тэму, дзе панарамна расказваецца пра далёкае і параўнальна нядаўняе мінулае, або творам, аўтары якіх цягацеюць да выкарыстання абагульнена-сімвалічнай вобразнасці, У вясковай прозе на працягу мінулага стагоддзя пераважаў аб’ектывізаваны тып мастацкага этнаграфізму, бо пісьменнікі імкнуліся да аб’ектыўнага бытапісання, суб’ектывізаваны тып мастацкага этнаграфізму прысутнічаў, як правіла, у творчасці пісьменнікаў, што цягацелі да абнаўлення паэтыкі (З, Бядулі, М, Гарэцкага, М, Стральцова, В, Казько), Амплітуда эксперыментавання з этнаграфічным матэрыялам пры паказе вясковай рэчаіснасці была не вельмі шырокай: большасць пісьменнікаў абмяжоўвалася рэпрадукцыяй, значна радзей выкарыстоўваліся істотная трансфармацыя і метатрансфармацыя, Апошні з названых тып мастацкага этнаграфізму па ступені апрацоўкі зыходнага матэрыялу пазначыўся ў творчасці аўтараў, якія не цураліся прыёмаў мадэрнісцкай манеры пісьма (З, Бядуля, М, Гарэцкі, К, Чорны), і набывае моц з другой паловы XX стагоддзя (В, Казько, Б, Пятровіч, А, Федарэнка),

Мастацкі этнаграфізм у беларускай прозе XX стагоддзя пра вёску выконваў ролю культуралагічную, сюжэтна-кампазіцыйную, а з канца XX стагоддзя ён нярэдка сімвалізуе з’явы нацыянальнага свету, Дынаміка мастацкага этнаграфізму ў беларускай вясковай прозе абумоўлівалася гістарычнымі абставінамі і фенаменальнай прыродай літаратурнай творчасці, Апісальнае ўзнаўленне рэчаіснасці, шырока распаўсюджанае ў пачатку мінулага стагоддзя, зараз усё часцей пры распрацоўцы традыцыйнай для нашай прозы тэмы замяняецца гісторыка-філасофскім асэнсаваннем,

## ЛІТАРАТУРА

1. Мартинкявичюс Ю, История и эпос // Литературное обозрение, - 1975. - № 5. - С. 60.
2. Скрыган Я. Кругі: Аповесць з дасказамі, - Мн.: Юнацтва, 1986. - 366 с.
3. Калюга Л. Творы. Раман. Аповесці. Апавяданні. Лісты. - Мн.: Маст. літ., 1992. - 607 с.
4. Сурганов В.А. Человек на земле: Тема деревни в русской советской прозе 50-х - 70-х гадоў. Истоки. Проблемы. Характеры. - М.: Советский писатель, 1981. - 624 с.
5. Каваленка В.А. Міфа-паэтычныя матывы ў беларускай літаратуры. - Мн.: Навука і тэхніка, 1981. - 320 с.
6. Корань Л. Цукровы пеўнік: Літ.-крыт. арт. - Мн.: Маст, літ., 1996. - 220 с.
7. Дзюбайла П.К. Гістарычны выбар пісьменнікаў Беларусі. Сучасны этап. 1955 - 1995 гады // Полымя. - 1996. -№ 12. -С. 235-274.
8. Пятровіч Б. Сон між пачвар: Апавяданні. - Мн.: Маст. літ., 1994. - 222 с.